мана, прошлое или память о прошлом охватывают и миф, и историю. Мифическое время – это время становления, тогда как историческое время – это дальнейшее существование и развитие уже ставшего. И тогда получается, что мифическое и историческое прошлое неразрывны, преемственны, и так называемые время истока и недавнее прошлое, которые Ян Вансина разделял пропастью «дрейфующей лакуны», культурная память скрепляет в единый поток развития.

Таким образом, культурная память помогает постичь историю, определяет понимание настоящего и влияет на историческое сознание общества, на «чувство истории», которое берет свое начало в мифическом, древнем прошлом. Более того, культурная память в обстоятельствах тоталитарного подавления становится освобождающей силой, актуализируясь в сложные периоды жизни народа, сплачивая его вокруг единой цели, идеи, национальной памяти, культурно-исторического наследия. Культурная память безгранична в том смысле, что посредством нее происходит осмысление прошлого в настоящем, через нее угадывается метафизический смысл истории, прослеживается путь от первоначала до современности, от истока человеческой культуры до ее зрелости. А еще она спасает от страшной современной тенденции к «одномерности», пришедшей с кризисом религии и довлеющей силой техники, виртуального мира и сознания. Именно «благодаря культурной памяти человеческая жизнь приобретает двухмерность или же двувременность, которые сохраняются на всех стадиях культурной эволюции» [1, с. 89].

Литература

1. Ассман, Я. Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / пер. с нем. М.М. Сокольской. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 368 с.

## СТАХАНАЎСКІ РУХ У ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БССР ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1930-Х гг.

***А.А. Субоцін***

(Навуковы кіраўнік: д.г.н., праф. Космач В.А.)

Асноўнай мэтай працы з'яўляецца адлюстраванне сувязей паміж стаханаўскім рухам і палітычным развіццём БССР ў другой палове 1930-х гадоў.

Феномен стаханаўскага руху зарадзіўся ў 1935 г. ва ўмовах мадэрнізацыі і станаўлення індустрыяльнага грамадства ў Беларусі. Акрамя сацыяльна-эканамічнага боку праблемы гэты рух трэба разглядаць і ў рэчышчы палітычных працэсаў перыяду сталінізму.

Адной з прычын разгортвання стаханаўскага руху была неабходнасць стварэння палітычнай апоры ўлады ў сферы прамысловасці, якая змагла б супрацьстаяць праявам апазіцыйных настрояў гаспадарчых кіраўнікоў і ІТР у адносінах да сталінскай мадэлі індустрыялізацыі. Партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва імкнулася аб'яднаць эканамічную мэту – павышэнне эфектыўнасці вытворчасці – с палітычнай. Пры гэтым "эканамічная рацыянальнасць" падмянялася "палітычным волевыяўленнем" [1, с. 206].

Тэндэнцыі да палітызацыі стаханаўскага руху намеціліся яшчэ ў канцы 1935 г. праз крытыку, адміністрацыйныя меры ў адносінах да

кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія не праяўлялі ініцыятывы для далейшага развіцця гэтай новай формы сацыялістычнага спаборніцтва. У гэтым сэнсе тэзіс пра неабходнасць павышэння пільнасці і выкрыцця класава-варожых элементаў у прамове Сталіна на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў [2, с. 374] азначаў пераход канфлікту паміж стаханаўцамі і партапаратам, які стаяў за ім, з аднаго боку, і гаспадарчымі кіраўнікамі – з другога, на палітычны ўзровень.

Стаханаўскі рух даваў станоўчыя вынікі ў павышэнні прадукцыйнасці працы там, дзе былі для гэтага рэальныя рэзервы, але калі пачалася так званая штучная "стаханавізацыя" краіны, укараненне ідэй 100%-га ахопу рухам, гэта прывяло да дэзарганізацыі кіравання вытворчасцю, зніжэння якасці прадукцыі, павышэння колькасці тэхнічных непаладак і г.д. Уся адказнасць за такі недахоп была ўскладзена на праціўнікаў стаханаўскага руху, як гаспадарчых кіраўнікоў, так і рабочых з асяроддзя рэальнай і ўяўнай апазіцыі. У сваю чаргу партапарат справацыраваў пашырэнне палітычных рэпрэсій у рамках палітычных акцый супраць "сабатажнікаў", "ворагаў народа" на прадпрыемствах. Повадам для такіх рэпрэсіўных мер магло стаць любое неасцярожнае слова ў адрас стаханаўца, невыкананне плана і іншае. Сакрэтная інструкцыя Палітбюро ў пачатку 1937 г. абавязвала дырэктароў прадпрыемстваў штомесяц праводзіць пасяджэнні з удзелам рабочых-стаханаўцаў, каб апошнія змаглі выступіць з крытыкай і абвінавачваннямі непапулярных кіраўнікоў [3, с. 285]. У гэтым жа накірунку адбываліся і грамадска-палітычныя акцыі з актыўным удзелам стаханаўцаў у адносінах да прадстаўнікоў так званага антысавецкага трацкісцкага цэнтра. Характэрным прыкладам гэтага з'яўляецца выступленне аднаго з стаханаўцаў Віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната: " Вораг шукае выхаду ў вайну, ён хоча напасці на наш Саюз, а гэтыя дыверсанты, шкоднікі, подлыя агенты Троцкага рыхтавалі глебу для нападу. Але вораг забыўся, што мы моцныя, што мы маем выдатную Чырвоную Армію, што намі кіруе любімы правадыр таварыш Сталін" [4, арк. 15].

Як бачым, улада пачала выкарыстоўваць стаханаўцаў ў якасці палітычнай зброі для папярэджвання "вылазак класавых ворагаў", ператвараючы стаханаўскі рух у крыніцу даносаў і татальнага кантролю ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Акрамя гэтага і сама актыўнасць рабочых-стаханаўцаў усё больш і больш залежала ад дзейнасці дзяржаўных і партыйных органаў. Так, 26 чэрвеня 1936 г. наркам унутраных спраў БССР І. Леплеўскі дакладваў у Маскву пра вынікі стаханаўскага дэкадніку па будаўніцтву дарог: "Зроблена 896 км дарог пры плане 751 км, план азелянення выкананы на 140,4%. Зараз асабліва націскаем на заканчэнне будаўніцтва мастоў, на вывазку гравія. Націскаем, каб тэмпы работ па будаўніцтву стратэгічных дарог, узятыя ў стаханаўскай дэкадзе, захаваць на дасягнутым узроўні. Адначасова на ўчастак дасылаю групу супрацоўнікаў НКУС для праверкі правільнасці выдаткаў і дакладнага ўліку колькасці дабытых матэрыялаў" [цыт. па 5, с. 449–450].

Такім чынам, стаханаўскі рух, у пэўным сэнсе, можна лічыць своеасаблівым каталізітарам палітычных рэпрэсій, што ўзнікалі як рэакцыя на вынік саміх метадаў увядзення гэтага руху без уліку ўмоў і магчымасцяў асобных прадпрыемстваў.

Літаратура

1. Кораблев И.Г. Роберт Майер. Стахановское движение 1935–1938 гг.

Стахановское движение как катализирующий фактор сталинизации советского общества / И.Г. Короблев // Отечественная история. – 1992. – №6.
2. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц –стахановцев. 14-17 ноября 1935 г. Стенографический отчёт. – М., 1935.
3. Хлевнюк О.В. Политбюро. Механизмы политической власти в 1930-е годы / О.В. Хлевнюк. – М., 1996.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці Ф. 96. Воп. 5. Спр.8.
5. Протько Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941) / Т.С. Протько. – Мн., 2002.

## ПАРТИЙНО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ ЖИЗНЬ ВИТЕБСКА В ПЕРИОД НЭПа (ПО МАТЕРИАЛАМ ГКК, ОКК И ОКРУЖКОМА)

***Е.В. Трущенко***
(Научный руководитель: к.и.н., доц. Яковлева Г.Н.)

Цель работы – осветить некоторые аспекты партийно-политической жизни Витебска в период НЭПа. К началу 1921 г. Витебская губернская партийная организация насчитывала в своих рядах 4807 чел. [1, л.5]. Однако с переходом к НЭПу численность ее начинает сокращаться. Исполняя решения X съезда партии по вопросам партийного строительства, 21 июня 1921г. ЦК и ЦКК РКП(б) приняли постановление о проверке, пересмотре и очистке состава партии [2, с. 438]. Исключению подлежали все сомнительные, ненадежные, не доказавшие своей устойчивости члены. По материалам газеты «Известия» Витебского Губисполкома и Губкома РКП(б) «% исключенных и выбывших по Витебской губернии колебался от 25 до 50%. Больше этого дал лишь один Витебский уезд» [2, л. 10]. Еще одной причиной сокращения численности был добровольный выход из организации. Это было связано с разочарованием в политике партии. НЭП рассматривался как отступление от построения социализма. К тому же он требовал знаний и компетентного подхода к решению экономических проблем. Большинство же партийцев продолжало ориентироваться на военно-административные методы. К началу 1924г. Витебская партийная организация насчитывала 2893 чел. [3, л. 2]. Но, начиная с ленинского призыва 1924 г., численность ее постоянно увеличивалась.

Ленинский призыв существенно изменил и социальную структуру Витебской партийной организации. До 1924 г. в ней преобладали служащие. В ноябре 1924 г. их удельный вес снизился до 30,3%, а процент рабочих составил 56,9%, из них рабочих от станка – 32,2% [3, л. 2]. «Орабочивание» партийного аппарата было достигнуто путем снижения кандидатского стажа для рабочих и крестьян. Доступ в партию для других слоев был ограничен. Особенностью Витебской партийной организации был ее многонациональный состав с преобладанием русской национальности до 1924 г. и белорусской – с 1925 г.

В период НЭПа продолжал оставаться чрезвычайно высоким уровень общей и политической неграмотности членов партийной организации. На 1924 г. в ней высшее образование имели только 2 чел., среднее – 78 чел. [4, л. 2]. Вступление в партию воспринималось многими как путь к карьерному росту, улучшению условий жизни, а не принятие на себя новых обязанностей.